мяжой, міжнародная суполнасць была вельмі слаба інфармавана, а шырокай грамадскасці ўвогуле было мала што вядома пра катастрофу. І гэта не дзіўна, калі ўлічыць той факт, што сапраўднае становішча пасля аварыі на ЧАЭС на пацярпелых тэрыторыях замоўчвалася савецкімі ўладамі больш за тры гады. У сувязі з гэтым МЗС БССР падкрэсліваў важнасць актывізацыі працы па развіццю двухбаковых прамых кантактаў, асабліва у тых краінах, дзе меліся пастпрэдствы рэспублікі, а таксама пражывалі суайчыннікі-беларусы.

Істотную ролю ва ўсталяванні трывалага падмурку для доўгачасовага міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне пераадолення наступстваў аварыі на ЧАЭС адыграла прынятце ў снежні 1990 г. рэзалюцыі Генеральнай Асамблеей ААН 45/190. Гэтая дата ўвайшла ў гісторыю як дзень прыняцця першага міжнародна-прававога акта, які кваліфікаваў Чарнобыль у якасці «з’явы беспрэцэдэнтных маштабаў» і падкрэсліваў сусветны, універсальны і доўгатэрміновы характар наступстваў катастрофы. Падзею гэтую мы сёння па праву можам лічыць перамогай беларускіх дыпламатаў на чале з тагачасным міністрам замежных спраў БССР П. Краўчанкам, які ўзначальваў рабочую групу па падрыхтоўцы рэзалюцыі. Вярхоўны Савет БССР у сувязі з прыняццем у ААН рэзалюцыі па Чарнобылю выступіў з заявай, у якой выразіў удзячнасць за прынятце дэкларацыі ўсім дзяржавам членам ААН, і яшчэ раз звярнуўся да замежжа адгукнуцца на настойлівы заклік 45-й Генеральнай Асамблеі аб аказанні неабходнай падтрымкі і практычнай дапамогі людзям, якія апынуліся ў надзвычайнай сітцацыі.

Калі сусветная супольнасць усвядоміла маштаб катастрофы, пачаў складвацца сусветны рух салідарнасці з ахвярамі Чарнобыля. Аднак пакуль Беларусь дэ-юрэ заставалася ў складзе Савецкага Саюза афіцыйная дапамога ішла у асноўным праз канал СССР — замежжа, і толькі потым даходзіла да БССР.

Падсумоўваючы, адзначым, што на працягу першых чатырох год пасля аварыі міжнароднае чарнобыльскае супрацоўніцтва выглядала даволі кволым. Прычыны гэтага хаваюцца і ў засакрэчэнасці вынікаў аварыі, і ў нежаданні звярнуцца па вонкавую дапамогу буйнога сусветнага гульца, якім быў тады СССР, і нельга забывацца на тое, што Беларусь тады ўваходзіла ў склад Савецкага Саюза, а значыць была істотна абмежавана ў ініцыятывах на міжнародным узроўні. Таму як вынік, запознены зварот да міжнароднай супольнасці, які не быў ужо такім эфектыўным, якім мог бы быць, калі б заклік па дапамогу замежжа пачула адразу пасля аварыі.

## ПІМЕН ПАНЧАНКА — УДЗЕЛЬНІК ДЭЛЕГАЦЫІ БССР НА XIII СЕСІІ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН

***Аўласенка І. М.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

У 2017 г. адзначаецца 100-годдзе з дня нараджэння Народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі. Акрамя багатай творчай спадчыны (больш за 30 зборнікаў вершаў), літаратурнай арганізатарскай дзейнасці (галоўны рэдактар часопіса

«Маладосць»), актыўнай грамадскай дзейнасці (дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, старшыня Рэспубліканскага камітэту абароны міру), у біяграфіі паэта ёсць яшчэ адзін прыкметны штрых: ён быў членам дэлегацыі БССР на XIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у 1958 г.

Удзел беларускага літаратара ў рабоце Генеральнай Асамблеі ААН — не адзінкавы выпадак. У розныя гады у складзе дэлегацыі БССР Нью-Ёрк таксама наведалі К. Крапіва, М. Лынькоў, П. Броўка. Зразумела, што галоўную ролю ў складзе беларускай дэлегацыі адыгрывалі прафесійныя дыпламаты (да прыкладу, кіраўнік беларускай дэлегацыі, міністр замежных спраў рэспублікі К. В. Кісялёў), а пазіцыя БССР была цалкам ўзгоднена з пазіцыяй Масквы. Разам з тым, зварот да ўдзелу П. Е. Панчанкі абумоўлены іншым. У сваёй запісной кніжцы паэт пакінуў шэраг цікавых думак, назіранняў, заўваг. Гэтыя запісы не змяшчаюць падрабязнасцей працэдурных момантаў сесіі, але разам з тым дазваляюць адчуць атмасферу, у якой працавала дэлегацыя БССР, паглядзець яго вачыма на сесію Генеральнай Асамблеі ААН, а таксама на паўсядзённае жыццё Нью-Ёрка. Запісы ў асноўным кароткія, без пазначэння даты (дзённік з дакладнымі датамі паэт пачаў весці ў 1961 г.).

Восень 1958 г., калі праходзіла XIII сесія Генеральнай Асамблеі ААН, — гэта час «адлігі», калі неўзабаве пасля выкрыцця культу асобы Сталіна адбывалася пераасэнсаванне афіцыйнай савецкай ідэалогіі, пазбаўленне яе ад найбольш адыёзных рысаў, характэрных для мінулых дзесяцігоддзяў, што абумоўлівала пэўныя надзеі на паляпшэнне жыцця. XIII сесія прыйшлася на той перыяд, калі аўтарытэт Савецкага Саюза стаў прыкметна ўзрастаць на міжнароднай арэне. Гэта было звязана як з актыўнай пазіцыяй СССР па падтрымцы антыкаланіяльных рухаў, так і з яго навукова-тэхнічнымі дасягненнямі. Невыпадкова паэт адзначыў у сваіх запісах: «У музеі гісторыі, унізе, стаіць макет першага савецкага спадарожніка».

Радкі з кніжкі сведчаць пра тое, што П. Панчанка цалкам падзяляў знешнепалітычную пазіцыю СССР, крытычна ацэньваючы дзейнасць Ватыкана, Ізраіля, а таксама тайваньскага ўрада, які на той час прадстаўляў Кітай у ААН: «Самае глыбокае спачуванне з прычын смерці Папы выказалі ў камітэце чанкайшыст і дэлегат Ізраіля».

Разам з тым, крытыку пісьменніка выклікалі самі паседжанні Генеральнай Асамблеі ААН. Яны падаліся пісьменніку занадта сумнымі і нецікавымі. Нават вядомы сваімі крытычнымі адносінамі да сходаў Саюза пісьменнікаў, Панчанка заўважыў: «Як многа доўгіх і нудных паседжанняў. З сімпатыяй успамінаю свае пісьменніцкія, якія некалі лаяў». «Многія міністры замежных спраў (і наогул дэлегаты ў камітэтах выступаюць не для таго, каб сказаць што-небудзь новае, а каб паўтарыць вядомыя ісціны для прэс сваёй краіны, каб паказаць, што і яны прымаюць удзел у вялікай палітыцы», — сведчыць іншы запіс.

Дзякуючы працягламу ўдзелу ў рабоце Генеральнай Асамблеі ААН, паэт меў магчымасць пазнаёміцца і з самім горадам Нью-Ёркам, які, паводле слоў паэта, «усмактаўся ў граніт каранямі труб і правадоў». Само паўсядзённае жыццё мегаполіса падалося паэту надзвычай хуткім, імклівым, напоўненым рэкла-

май, нязвыклай для савецкага жыхара: «Рэклама. Усюды што-небудзь але гарыць, палае, бегае, крыўляецца, успыхвае, мільгае, падміргвае, пускае дым, страляе з пісталета». «Нью-Ёрк ужо з самага ранку імкнецца падсунуць табе якую-небудзь дрэнь. Тут цяжка зразумець, што сапраўднае, а што падробка». Апісваючы Ніжні Манхэтэн (ці «Даўн-таўн» — асноўны эканамічны, дзелавы цэнтр Нью-Йорка), пісьменнік даў такую характарыстыку гэтаму раёну: «Быт і пах вялікага мястэчка». У сваіх запісах паэт звярнуў увагу таксама на негатыўныя сацыяльныя з’явы, падзеі з крымінальнай хронікі: забойства падлеткам сваіх бацькоў, раптоўны напад паліцэйскага на наведвальнікаў рэстарана, — тыя праблемы, якія і сёння з’яўляюцца актуальнымі для Злучаных Штатаў і звязаныя з канстытуцыйным правам грамадзяніна ЗША валодаць зброяй.

Удзел П. Панчанкі ў сесіі Генеральнай Асамблеі ААН прыпаў на час перадвыбарчай барацьбы ў штаце Нью-Ёрк (выбары адбыліся 4 лістапада 1958 г.). Гэта пісьменнік таксама адзначыў у сваіх запісах: «Усюды развешаны партрэты двух кандыдатаў у губернатары Нью-Ёрка: Нельсана Ракфелера і Гарымана. Абодва мільярдэры. Часопісы і газеты запоўнены іх здымкамі. Гарыман — адзін з дзесяці самых элегантных мужчын Амерыкі. Нельсан — спартсмен, мецэнат». На гэтых выбарах перамогу над дзеючым губернатарам — У. Гарыманам — атрымаў Н. Ракфелер, які праз паўтара дзесяцігоддзі стаў віцэ-прэзідэнтам ЗША.

Аднак на многія рэчы дэлегат ад БССР П. Е. Панчанка глядзеў вачыма творчага чалавека, паэта, што адлюстравана ў асобных вобразных радках: «Будынак ААН — гэта зялёна-блакітная глыба лёду, якая ўпёрлася ў неба і не тае. Некаторыя хочуць, каб на растаяла, і таму там часам вядуцца занадта гарачыя спрэчкі». «У ААН (зала пленумаў) над трыбунай старшыні, як цэль нейкага ціра выява зямнога шара. І хто толькі не цэліцца ў яго!».

Пазней, пасля вяртання ў Беларусь, П. Е. Панчанка выпусціў шэраг кніг вершаў — «Кніга вандраванняў і любові», «Нью-Йоркскія малюнкі», «Тысяча небасхілаў», «Чатыры кантыненты», — у якіх вобразна апісаў і свае назіранні падчас падарожжа ў Амерыку. Для напісання некаторых вершаў падмуркам сталі асобныя нататкі з запісной кніжкі. Некаторыя з вершаў — «Нью-Йорскія малюнкі», «У даўн-таўне», «Размова з Вашынгтонам» — змяшчаюць іранічна-скептычны погляд на амерыканскі лад жыцця.

З аднаго боку, гэта цалкам натуральная пазіцыя для літаратара ў гады «халоднай вайны», пад час ідэалагічнага супрацьстаяння дзвюх сістэм, калі трэба было паказаць савецкі бок ў лепшым свеце, сканцэнтраваўшы ўвагу на асобных заганных з’явах амерыканскага жыцця. Разам з тым, нататкі з запісной кніжкі пісьменніка сведчаць пра тое, што гэты погляд, адлюстраваны на старонках вершаў, у цэлым адпавядае тым радкам, што паэт пакінуў у сваёй запісной кніжцы. Вернасць камуністычным ідэалам і скептычнае стаўленне да заходняга ладу жыцця захавалася ў паэта і пазней. Нават праз два дзесяцігоддзі, у самы разгар брэжнеўскага «застою», выкрываючы раўнадушша і чэрствасць, п’янства і хамства ў савецкім грамадстве, паэт у сваіх дзённікавых запісах

ускосна пазначыў: «І адкуль усё гэта нахлынула? Перад вайной, у час вайны, пасля вайны — цудоўнейшы народ быў! Тут на ўплыў Захаду не спашлешся (хоць фільмы, паездкі ў Еўропу, розны зарубежны хлам уплываюць)».

Такім чынам, спадчына П. Е. Панчанкі, пакінутая ў апублікаваных вершах і ў нататках з запісной кніжкі, з'яўляецца цікавай крыніцай, якая дазваляе паглядзець на сесію Генеральнай Асамблеі ААН і на паўсядзённае жыццё Нью-Ёрка вачыма ўдзельніка беларускай дэлегацыі — не прафесійнага дыпламата, а творчага чалавека, паэта савецкага часу.

## ДИПЛОМАТИЯ БЕЗОПАСНОСТИ: ОТ ТЕОРИИ К ПРАКТИКЕ

***Буконкин Д. А.,*** *Белорусский государственный университет*

Безопасность выступает в качестве одной из базовых потребностей личности в иерархии потребностей знаменитого психолога А. Маслоу. Именно со стремлением к обеспечению безопасности многие философы и ученые связывают возникновение общества и как его производной — государства. Существование современного государства неразрывно связано с вопросами обеспечения безопасности. Это позволило многим ученым сделать вывод о том, что безопасность это основная нормативная цель государства. Подобной идеи в частности придерживались Т. Гоббс и Ч. Тилли.

И если в качестве «ночного сторожа» государственная власть берет на себя ответственность внутри страны за покой каждого гражданина, то перед лицом внешних угроз требуется поиск эффективных инструментов обеспечения суверенитета, независимости и безопасности граждан.

В теории международных отношений обеспечение безопасности реализуется следующими тремя группами инструментов:

— односторонние меры
— двусторонние меры
— многосторонние меры

**Односторонние меры** традиционно понимаются как создание средств защиты государством от существующих и потенциальных угроз. На практике создание средств обеспечения безопасности заключается в первую очередь в формировании вооруженных сил и системы традиционно именуемой «силовым блоком», способных противостоять внешним врагам.

С ходом времени совершенствовались орудия уничтожения. Апогеем данного процесса можно считать изобретение ядерного оружия, которое стало средством сдерживания, предотвращающим глобальные конфликты между сильнейшими акторами. Именно создание ядерного оружия позволило миру вступить в систему биполярных отношений, когда каждая из сторон понимала, что в случае открытого противостояния существует угроза применения самых мощных средств уничтожения, имеющихся в распоряжении обеих супердержав и, в последствии, «гарантированного взаимного уничтожения». Подобная система взаимоотношений получила название «холодная война», когда кризисы и конфлик-